Первый мяч хозяева забили после несогласованных действий вратаря и защитника Дениса Куцко. Форсажевцы ринулись вперёд и были дважды близки к цели, но хозяева смогли отстоять свои ворота и провели быструю атаку, в которой смогли развить свой успех. У хозяев наблюдалась игровая дисциплина, просматривалась командная игра, но и один компонент всё же мешал хозяевам — это чересчур грубая игра.

Слонимчане, оставшиеся без спортивного зала, чуть утратили былую уверенность и сыгранность. Пришлось сыгрываться сразу в игре. Хозяева воспользовались огрехами соперника и увеличили счёт до неприличного — 4:0. Хозяева на 30-й минуте нахватали шесть командных фолов, гостям представился шанс пробить трижды 10-метровые штрафные удары. Два из них запорол Олег Герасимчик, с третьей попытки Денис Куцко смог отквитать один мяч до перерыва.

МОМЕНТЫ ИГРЫ

Перерыв пошёл на пользу гостям. Внесённые изменения в игру дали свои плоды. Быстрые смены игроков и агрессивный прессинг позволил показать, кто такой «Форсаж».

Вначале Сергей Кутищев отменно сыграл на опережение и неотразимо низом пробил по воротам — 4:2. После этого забитого гола слонимчане стали переигрывать своих соперников по всем статьям. На последнем рубеже несколько вылазок зельвенской «Энергии» отразил Александр Комлев. На 55-й минуте игры слонимчане проводят хорошую атаку на скорости Кутищев-Герасимчик-Куцко. Последний добивается успеха — 4:3.

Дальше гости просто смяли соперника. Но появилось новое препятствие — судейский барьер. Частые фолы и нецензурная брань в адрес судей со стороны хозяев осталась незамеченной. Даже между собой два рефери не смогли прийти к общему знаменателю и стали спорить, кто лучше знает правила игры.

Выход один на один с вратарём Олега Герасимчика и грубый приём вратаря хозяев, вышедшего далеко за пределы штрафной площади, судьи не посчитали нарушением. И всё же гости добились своего. Денис Куцко восстановил паритет, точно пробив по воротам со штрафного.

После того как счёт стал ничейным, оставалась лишь малость, чтобы добиться победы, но было упущено четыре голевых момента. Страсти в игре накалялись. Судьи решили, что ничья для первого матча — хороший исход. В итоге ещё 1 минуту и 40 секунд команды не доиграли.

В связи с реконструкцией спортивного комплекса игры первого круга «Форсаж» проводит на выезде. Первая домашняя игра запланирована на 28 декабря.

РЕЗУЛЬТАТЫ ТУРА

«Энергия» (Зельва) — «Форсаж» (Слоним) — 4:4

«Цементник» (Красносельский) — «БелЛакт» (Волковыск) — 12:6

«Легенда» (Ивье) — Гроднолифт — 11:10

«Мелиоратор» (Островец) — Ошмяны — 13:6

Вороново — «Вилия» (Сморгонь) — 3:3

ДСПМК-72 (Лида) — Скидель — 5:0.

Егор ЖИГАЛИК
Фото автора

БЫЛЬ

Святланыч

Гэтую гісторыю распавёў мне мой сваяк, дзядзька Іван Пятліцкі з вёскі Харашэвічы. Дарэчы, Івана Антонавіча ўжо няма сярод нас. А ён пражыў нялёгкае жыццё. У час Вялікай Айчыннай вайны партызаніў у родных мясцінах. Вярнуўся да мірнага жыцця калекам, бо быў некалькі разоў паранены.

Мне дзядзька казаў: "Хто зведаў ваенныя цяжкасці, таму мірнае жыццё проста асалода". Івана Антонавіча ведалі людзі як вялікага аптыміста. Ён вельмі радаваўся дзецям. У сваёй сям'і яны з Вольгай Пятроўнай выгадавалі чатвярых дзяцей. З вялікім задавальненнем Антонавіч сустракаў унукаў і забаўляўся з імі, як толькі яны прыязджалі да бабулі і дзядулі ў госці з Мінска альбо Гродна. Да яго цягнуліся дзеці, бо ён умеў з імі сябраваць. І дарослыя паважалі яго.

Іван Антонавіч быў выдатны кравец. Сядаў на ровар і накіроўваўся па навакольных вёсках, прымаў і выконваў заказы на пашыў адзення. Гэтыя дзядзькавы вандроўкі часам зацягваліся на тыдні. Таму знаёмых было ў дзядзькі паўраёна.

У той час я працаваў настаўнікам у сельскай школе. І падчас летніх канікулаў накіроўваўся з сям'ёй у Харашэвічы. З Іванам Антонавічам мы наведвалі на маіх "Жыгулях" партызанскія сцежкі. Спачатку ехалі, затым ішлі па лесе пешкі.

Мы з Іванам Антонавічам спыняліся ў тым месцы, дзе калісьці ён расстраляў семярых фашыстаў. Фрыцы балявалі пасля таго, як накіравалі ў нямецкае рабства мясцовую моладзь. Чаму яны выбралі тое месца, невядома. Мабыць, вярталіся са Слоніма, дзе праходзіць чыгунка, і ім не цярпелася адзначыць гэтую падзею. Прыхапіўшы напоі, яны спыніліся ў хмызняку, каб ніхто не бачыў. Але ж Іван, вяртаючыся з вёскі, пачуў моцныя галасы, якія рэхам каціліся па лесе.

Я ў той час, дзякуючы дзядзьку Івану, меў шмат матэрыялу для выхаваўчай работы з вучнямі. Ды не толькі я распавядаў вучням пра дзядзьку — абаронцу Радзімы. Нягледзячы на тое, што ён быў інвалідам вайны першай групы, усе работы па дамашняй гаспадарцы выконваў сам. Нарыхтоўваў на ўсю зіму дровы, рамантаваў забудовы. І нават трымаў на падворку бычка, якога называў дзеля жарту (для дзяцей і ваякоў) Маёрам. Калі хто цікавіўся, навошта Антонавічу такія клопаты, дзядзька адказваў, што дапамагае калгасу выконваць план

Святланыч

па здачы мяса і разам уносіць свой уклад у дзяржаўную "Харчовую праграму".

А калі па праўдзе, Іван Антонавіч проста па-сялянску шкадаваў любую жывёлу. Ён казаў: "Усё, што на гэты свет з'явілася, павінна жыць. Таму што так патрэбна". І нават з вялікім жалем аддаваў свайго гадаванца, Маёра, у калгас, бо ведаў, што бычок хутка трапіць на мясакамбінат.

Быў у дзядзькі паважаны сябра Мікалай, яшчэ з партызанкі. Ён жыў у Слоніме і меў сваю хату. Мікалай лічыўся вопытным паляўнічым і заядлым рыбаловам. Аднойчы Іван Антонавіч ехаў лесам дахаты. Якраз быў паляўнічы сезон. Іван сустрэў са стрэльбай на плячы Мікалая, які таксама збіраўся дамоў без ніводнага ўпаляванага трафея. Ды раптам побач з імі прамчалася ліса. Відаць, яна ўцякала ад пагоні, бо чутны былі галасы сабак. А лясная рыжуха, спалохаўшыся, не выбірала сабе шляху і зусім выпадкова нарвалася на людзей. Але ж Мікалай хутка зрэагаваў, узняў стрэльбу і прыцэліўся. Ды Антонавіч скіраваў рулю стрэльбы не ў той бок. Грымнуў стрэл. І на зямлю ўпалі дзве галінкі з высокай сасны.

—Ты што зрабіў? — злосна закрычаў паляўнічы. — Мабыць, звар'яцеў, ці што? Такое рэдка здараецца, каб сама прыгажуня ліса прыйшла ў самыя рукі!

— Вось у гэтым і справа, — спыніў сябра Іван Антонавіч. — Ты заўважыў, як яна, быццам рыжая хваля, слалася па зялёным лесе. Такой прыгажосцю толькі любавацца трэба, а не знішчаць яе.

—Па-твойму, мая жонка ніколі не будзе мець лісінага каўняра? — запратэставаў Мікалай.

—Каб твая Ліза бачыла, як прыгожа ліса ўцякала, то, напэўна б, пагадзілася са мной.

—Дык хай будзе па-твойму! — махнуўшы рукой, згадзіўся Мікалай.

Гэты выпадак Іван Антонавіч успамінаў некалькі гадоў назад, а я занатаваў яго ў сваім блакноце. Так і захоўвався гэты запіс, пакуль я не ўбачыў па тэлебачанні перадачу, як падлеткі павесілі бяздомнае сабачанё. Ды якраз яшчэ раз я перачытаў кніжку пра Белага Біма Чорнае вуха. Мяне заўжды хвалюе вечная праблема выхавання ў падлеткаў беражлівых адносін да братоў нашых меншых. Бо з гэтага далей фарміруюцца і адносіны паміж людзьмі.

Дык вось. Неяк заехаў Іван Антонавіч ў Слонім да Мікалая. Пачуўшы, што Мікола пайшоў у краму, не захацеў наведвацца ў хату. А на вуліцы было вельмі спякотна. У чаканні сябра ўбачыў дзядзька коўдру на траве. Стомлены надвор'ем, ён прылёг і задрамаў. А скрозь сон адчуў, што хтосьці ліжа яму нос. Адкрыўшы адно вока, убачыў шчанюка і вырашыў яго адпудзіць пстрычкай у лоб. Так і зрабіў. Шчанюк завішчаў і адскочыў убок.

У той час Антонавіч не надаў гэтаму ніякага значэння. Але ж пазней пацікавіўся ў Мікалая, адкуль узяўся гэты сабачка. Сябра патлумачыў, што Ліза мае ў горадзе сяброўку, якая пачала займацца народзістымі сабакамі. Гэта яе новы бізнес. Ды з апошняй партыі застаўся адзін нязграбны шчанюк. Каб не сапсаваць сваю рэпутацыю гандляркі, яна не адважылася яго прадаваць. І не хацела, як водзіцца заўжды, тапіць яго ў сажалцы. Так шчанюк дастаўся ў якасці падарунка Мікалаю да дня нараджэння.

Праз год ці крыху болей Антонавіч зноў прыехаў да Мікалая. Яго сустракаў ужо вялікі прыгожы сабака. Дзядзькавага спадарожніка, які быў суседам Мікалая, віляючы хвастом, сабака прапусціў у хату. А на Антонавіча пагрозліва зароў. Дзядзька толькі падумаў: няўжо памятае тую пстрычку? Разумны вельмі!

—Ого, Святланыч! Ён усё памятае і разумее, — патлумачыў Мікалай. — Аднойчы я, узяўшы ў рукі граблі, накіраваўся на сенакос. Другі раз яны мне былі не патрэбныя. Дык Святланыч вярнуўся дадому і прыцягнуў граблі ў сваіх зубах. Вось які ён гаспадар!

—А чаму Святланыч? — пацікавіўся Антонавіч.

—Суседава пяцікласніца Святланка вельмі прывязаная да яго, — растлумачыў Мікалай. — Ён яе ў школу выпраўляе і са школы сустракае. І нікога да яе не падпускае. Аднойчы здарылася, што зімой Светка ўпала і нагу вывіхнула. А Святланыч брахаў, не дазваляў нікому наблізіцца да дзяўчынкі. Толькі яна ўгаварыла сабаку, што гэта ж свае людзі.

Так зрабіў і Мікалай. Ён паклікаў Святланыча да сябе і сказаў, што Антонавіч яго сябра, а гэта азначае, што ён свой чалавек. А яшчэ дазволіў дзядзьку пагладзіць сабаку па шыі і хрыбту. Святланычу гэта спадабалася. Ён нават завіляў хвастом і ўладкаваўся на некаторы час каля Антонавіча.

З таго часу Святланыч здалёку чуў набліжэнне Антонавіча на ровары. Сабака пачаў пазнаваць гук матора машыны суседа Антонавіча Васіля, з якім дзядзька ездзіў у горад. Святланыч імкліва кідаўся насустрач госцю.

Аднойчы восенню, калі капалі бульбу, Антонавіч дапамагаў Мікалаю і, загрузіўшы мяхі, адправіў аўтамашыну, а сам застаўся ў полі. Заўважыўшы, што яго няма на падворку, Святланыч адмахаў больш за дзесяць кіламетраў, апынуўся побач. Праўда, вельмі напалохаў Антонавіча, які падумаў, што па лесе шныраць дзікі. Здзіўляла вяскоўцаў і тое, што сабака нібы разумеў людзей. Ён уважліва слухаў суседзяў і глядзеў у вочы таго, хто гаворыць.

Святланыч жыў без прывязі на падворку Мікалая каля васьмі гадоў. Але здарылася бяда: на яго наляцеў матацыкліст. Малады байкер выскачыў з варот свайго дома і наехаў проста на сабаку. У аварыі кіроўца матацыкла абышоўся лёгкім спалохам. А Святланыч атрымаў моцнае пашкоджанне хрыбетніка. З той пары ён валок па зямлі свой азадак.

Балюча было глядзець на яго. Святлана кожны дзень прыходзіла да яго ўся ў слязах. Яна прыносіла свайму любімцу розныя ласункі. Сама не ела, а сабаку карміла. Мікалай казаў, што ўсыпіць яго — рука не падымаецца. А вось зладзіць яму райскае жыццё — гэта было ў сілах гаспадароў.

На жаль, балючая рана Святланыча нагадвала пра сябе. Але ж апошнія гады свайго жыцця сабака праводзіў з райскімі прывілеямі: у цяпле, дабрыні, на свежым мясе і сырадоі. Усё гэта ён у гаспадароў заслужыў.

Кастусь СТАНКЕВІЧ

ПАЭЗІЯ

Таццяна ТРАФІМЧЫК

ТУТ КРЫК І СМЕРЦІ, І ЖЫЦЦЯ!

АСЕННІ НАСТРОЙ

Імчыць жыццё
няспыннай хваляй,
Зірне паспешна,
крочыць далей,
Няма спакою, чалавеча,
Цябе турботы круцяць
вечна.
Але здараецца часіна,
Калі душа сказаць павінна,
Што ўсе дарэмны намаганні,
Імкненні нашы, спадзяванні.
І замаўкае наваколле:
Спакой і ціша ў прыволлі.
Прырода моўчкі паміpае,
Цябе да сэрца працінае.
Лісты злятаюць амярцвела,
Вятры галосяць анямела!
На небе воблак пачарнелы,
Як водбліск жыцця
зледзянелы.
Нясецца жаль
ад даляглядзу,
Няма пяшчоты для пагляду,
Крычыць трывожна
птушак вырай,
Табе усё ужо няміла.
Але пяройдзе час нягоды,
Калі душа ўсяе прыроды
Зноў ажыве і заспявае,
Табе надзеі павяртае.

ЯКІМАВІЧЫ

Хацінка на курыных
ножках,
Вось камінок, нібы шкілет,
Ліпяць на дашку
дранак дошкі…
А ў сэрцы боль і іншы свет.

Чаму так смутак завалодаў
Маёй душою? Так працяў?
Вядзе дарожка да парожка,
Ды ў хатачцы няма жыцця.

Чаму душы замілаванне,
Чаму і роспач, і адчай?
Мо ад таго,
што тут світанне
Было прыгожым, нібы рай?

Тут так даўно жыла надзея
І беларускі звычай хат.
Хлапчына з сэрцам
дабрадзея
Мо жыў тут і кахаў дзяўчат.

А мо бабулька, як зязюлька,
Што хату прыбірэ з душой,
А можа шчырая матулька
Чакала сына на пастой.

Святая хата і сядзібы,
Іконы, ручнікі, куцця…
А зараз выбітыя шыбы.
Тут крык і смерці, і жыцця!

ТАКОЕ ЖЫЦЦЁ

Сустрэча ў дарозе

У вагоне цягніка Ліда — Маладзечна было па-асенняму холадна і няўтульна. Вера Абламей села насупроць бабулькі ў старой плюшаўцы, якія ўжо даўно не носяць і якая ад часу з чорнай ператварылася ў рудую.

—Ну і халадзіна, — паскардзілася.

—Нічога, гэта пакуль, а потым, як крыху праедзем, стане цёпла. Я ведаю, бо кожны тыдзень важу ў Ліду яйкі прадаваць, — адразу ж абазвалася бабулька. — А вы ж ці далёка едзеце?

—Далекавата, — неахвотна прамовіла Вера. Яна ўжо не рада была, што зачапіла старэнькую. Цяпер прыйдзецца адказваць на розныя непатрэбныя пытанні, неяк падтрымліваць гутарку.


МАЛЮНАК ЯЎГЕНА ІВАНОВА

Пасажыраў у гэты будні, да таго ж халодны дзень было мала. І Вера не паехала б, каб у сына не парваліся боты. Ушчэнт. Учора, так бы мовіць, ён паставіў яе перад фактам. Паклікаў з настаўніцкай у калідор і моўчкі выставіў уперад нагу.

—Мая мама настаўніца, а я хаджу ў парваным абутку. Каб быў, скажам, пачаткоўцам, а то ж у выпускным класе. Хлопцы, як убачаць, засмяюць. Добра, што сам першы заўважыў.

—Ідзі, нешта прыдумаем, — буркнула яна.

А што тут надта падумаеш? У вясковым магазіне такога тавару няма. Прыйшлося ехаць у Ліду. Хацела ўзяць з сабой Віталіка, але ў яго кантрольная па матэматыцы. Нейкія падабрала сама, дамовіўшыся з прадаўцом, што калі не падыдуць ці не спадабаюцца, то прывязе назад.

Цягнік ужо гатовы быў адправіцца, як у вагон зайшоў хлопец бамжаватага выгляду. Куртка і штаны былі добра паношаны, старая кепка насунута ледзь не на вочы. Ён зняў з пляча рукзак і кінуў на сядзенне насупроць Веры. Старэнькая, убачыўшы хлопца, памкнулася ўстаць, але той выставіў нагу ўперад, каб перагарадзіць шлях:

—Не бойся, бабка, я не кусаюся.

Калі ўсміхнуўся, стала відаць, што ў яго няма двух пярэдніх зубоў. Каб не гэта акалічнасць, то ўсмешка ў яго прыгожая. Ды і сам прыгожы: высокі, стройны, вочы чорныя, густыя чорныя вейкі. У мяне мільганула думка, што ў іх з Верай ёсць нейкае падабенства, ледзь улоўнае, але ёсць.

Пакуль я разважала, хлопец дастаў з рукзака пачатую бутэльку гарэлкі, адкаркаваў і зрабіў некалькі глыткоў. Жэстам бывалых выпівох выцер рот. І раптам застыў у нямым здзіўленні: Вера Антонаўна Абламей! Уласнай персонай! Вось дык сустрэча!

Кабета заёрзала на сядзенні, потым утаропілася ў акно. Здавалася б, каб яно было адчынена, выскачыла б туды.

—Глядзіце, людзі! — заклікаў захмялелы хлопец. — Маці роднага сына не пазнала! Дзе ж такое было? Кажуць, маці нават па маленькіх рысках пазнае сваё дзіця, а гэта нават глядзець не хоча.

Усе, хто быў у вагоне, навастрылі вушы і скіравалі сюды свае позіркі. Вера спачатку пабялела, а потым пачырванела.

—Ігар? Адкуль ты тут узяўся? — спытала са страхам.

—А адтуль, куды трапіў па тваёй віне. Хіба забылася, дзе я правёў пяць гадоў? Проста дзіва, якая ў цябе кароткая памяць.

—Замоўкні! — зашыпела Вера і паднялася з сядзення, каб, як і надоечы бабулька, уцячы з гэтага месца, але Ігар і ёй перагарадзіў дарогу.

—Куды ж ты?! Сядзі! Я зараз асвяжу тваю памяць. Дык вось… Ты ніколі не зважала на сям'ю, а жыла толькі для сябе. Наш бацька ўцёк да другой жанчыны ад тваіх пастаянных здрадаў і скандалаў. А ты ж, акрамя ўсяго гэтага, і за нож пачала хапацца. Славам, уцёк своечасова. А нам з братам Віталікам куды ўцякаць, дзе мы каму патрэбны? З табой засталіся.

Ігар зноў дастаў з рукзака бутэльку і выпіў. Потым працягваў далей:

—Значыць, мы засталіся. Брат хадзіў у школу, а я вучыўся ў ПТВ, калі ты прывяла ў дом мужчыну, які і дня не мог пражыць без гарэлкі. Праз два тыдні мара аб жаночым шчасці ў цябе рассыпалася на друзачкі. І вось аднойчы, калі на кухні мы селі вячэраць і ён пачаў абражаць цябе ўсякімі брыдкімі словамі, ты схапіла са стала нож. Мы з братам і апамятацца не паспелі, як ты спрытна, нібы гэтым усё жыццё займалася, усадзіла яму лязо ў сэрца. Я, крыху апамятаўшыся, закрычаў: "Трэба выклікаць участковага! Скажу, што гэта я зрабіў, бо калі пакажу на цябе, то цябе ж пасадзяць. З кім жа тады застанецца Віталік? Ён жа зусім яшчэ малы…"

Памятаеш, як на допыце і на судзе я цвердзіў, што твой сужыцель цябе пастаянна крыўдзіў, біў, таму я яго і зарэзаў? А ты хаця б на судзе абвергла гэты довад. Я так спадзяваўся, так раскайваўся потым, што ўзяў тваю віну на сябе. Каму ж хочацца ў турму, ды яшчэ ў такім маладым узросце? Тым больш за забойства, якое я не здзяйсняў. Але ты маўчала…

А ці памятаеш, колькі пісем я табе напісаў за гэтыя гады, але ты ні на адно не адказала? Ці ведаеш, колькі слёз праліў, молячы цябе аб спатканні? Да ўсіх жа прыязджалі, а да мяне ніхто. А так хацелася ўбачыць цябе, дакрануцца да тваёй рукі, пачуць словы спагады і падтрымкі. Нічога гэтага я не дачакаўся. І душа мая нібы абрасла акалінай, праз якую цяпер не прабіваюцца ні спагада да людзей, ні іхні боль. Жорсткім я стаў! Думаў, прыеду дадому і ўсё выкажу табе, рыхтаваўся да такой сустрэчы. А тут наладзіў публічнае выступленне.

Вера, якая да гэтага часу маўчала, апусціўшы долу вочы, прамовіла:

—Даруй…

—Не, — пахістаў п'янай галавой сын. — Ніколі не дарую!

Цягнік спыніўся, дзверы адчыніліся. Вера кінулася да выхаду. Гэта быў не яе прыпынак, але сорам пагнаў з вагона. А Ігар паехаў далей. Перасеўшы на яе месца, паклаў пад галаву рукзак і неўзабаве заснуў.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

ПРОИСШЕСТВИЯ

ЗАДЕРЖАН БРАКОНЬЕР С СОЛИДНЫМИ ОХОТНИЧЬИМИ ТРОФЕЯМИ

В охотугодьях у деревни Кривульки Мостовского района госинспекторы Щучинской МРИ задержали мужчину, который перевозил тушу незаконно добытой косули.

Ружья при нем не было. А вот в доме нашлось целых два, причем одно из них — незарегистрированное, сообщает Госинспекция охраны животного и растительного мира Республики Беларусь.

При осмотре домовладения в хозпостройках было обнаружено 18 черепов косули, 2 черепа лося и 5 бобровых шкур.

В отношении задержанного возбуждено уголовное дело.

Анна ВОЛОДАЩУК

ПОДСТРЕЛИЛ НЕЗАКОННО

Житель Волковысского района ответит за незаконную охоту.

Вблизи деревни Новосады Свислочского района работники управления оперативного реагирования в охотугодьях задержали жителя Волковысского района, который без разрешительных документов добыл дикого кабана.

В отношении нарушителя возбуждено уголовное дело за незаконную охоту. Об этом сообщает Госинспекция охраны животного и растительного мира Республики Беларусь.

Анна ВОЛОДАЩУК

ЗДАРЭННІ МАСТОЎШЧЫНЫ

МАШЫНУ СКРАЛІ Ў ГРОДЗЕНСКІМ РАЁНЕ, А РАЗАБРАЛІ Ў МАСТОЎСКІМ

Напрыканцы мінулага тыдня ўзбуджана крымінальная справа ў адносінах да невядомага, які ў ноч з 13 на 14 лістапада ў вёсцы Квасоўка Гродзенскага раёна скраў аўтамабіль "Фольксваген-Гольф".

Праз некаторы час машына была знойдзена ў лесе ля вёскі Вялікія Сцяпанішкі Мастоўскага раёна. На аўтамабілі адсутнічалі акумулятар, радар-дэтэктар, дамкрат, помпа, набор ключоў, газавы балон і іншае. Па факце вядзецца следства.

ПАГАСЦІЛА НА ДВА МІЛЬЁНЫ

Пенсіянерка з вёскі Стральцы Мастоўскага раёна наведала амаль дзевяностагадовую суседку.

Пасля гасцявання суседкі ў гаспадыні знікла амаль 2 млн. рублёў.

Па гэтым факце ўзбуджана крымінальная справа.

Язэп ПАЛУБЯТКА

АНАЛИТИКА

УВЕЛИЧИТЬ ЗАРПЛАТЫ БЕЛОРУСОВ МОГУТ ТОЛЬКО РЕФОРМЫ

Четыре года назад белорусские власти планировали, что зарплата белорусов к 2015 году достигнет 1000 долларов в эквиваленте.

Сегодня очевидно, что эта цель недостижима — месячный доход почти 40% работников, согласно данным официальной статистики, не дотягивает и до 500 долларов. Вместе с тем эксперты Всемирного банка считают, что доходы белорусов могут удвоиться и достигнуть уровня соседних стран. В случае проведения структурных реформ.

Источник: расчеты Всемирного банка

ИСКУССТВЕННЫЙ РОСТ ДОХОДОВ НАСЕЛЕНИЯ ОСТАНОВИЛСЯ

В последние месяцы рост зарплат в Беларуси существенно замедлился. Если за первую половину года средняя зарплата увеличилась в номинальном выражении почти на 900 тыс. рублей и достигла в июне 6,2 млн. рублей, то в июле-сентябре произошел коренной перелом — средняя зарплата за третий квартал выросла по сравнению с июньским уровнем только на 2,3% и составила в сентябре 6,34 млн. рублей.

В реальном выражении (то есть с учетом инфляции) и вовсе наблюдается снижение доходов населения. Так, в сентябре реальная зарплата сократилась на 2% по сравнению с аналогичным месяцем прошлого года, в августе — на 5,1%.

Изменения в динамике зарплат, зафиксированные в третьем квартале, произошли после того, как в этот процесс вмешалось правительство.

Напомним, что в августе 2014 года вступило в силу решение Совмина, согласно которому госпредприятия могут увеличить зарплаты своим работникам только при условии адекватного повышения производительности труда. Учитывая, что производительность эта растет медленно и в стране доминируют госпредприятия, решение правительства сразу же повлияло на динамику средней зарплаты.

Шаг, сделанный властями, соответствует рекомендациям международных финансовых организаций, которые говорят о том, что рост зарплат в Беларуси должен быть жестко увязан с темпами роста производительности труда, иначе могут возникать негативные последствия в виде инфляции и ослабления курса национальной валюты.

По мнению экспертов Всемирного банка, Беларусь в последние годы этому правилу не соответствовала, и ускоренный рост зарплат существенно увеличил издержки отечественных предприятий. Продолжение такой политики, считают экономисты международной организации, крайне нежелательно.

Увязав в августе административным образом темпы роста зарплат с динамикой производительности труда, белорусские власти тем самым признали, что возможности для искусственного увеличения доходов населения ограничены.

В то же время, по оценкам Всемирного банка, Беларусь по доходу на душу населения отстает от других стран (с аналогичным уровнем человеческого развития) примерно в два раза. Если в Беларуси доход на душу населения составляет 6800 долларов, то в соседних странах — порядка 12 000 долларов. Чтобы достичь более высокого уровня доходов населения, эксперты банка рекомендуют пойти на структурные реформы белорусской экономики.

По мнению внешних наблюдателей, базовые предпосылки для повышения эффективности белорусской экономики существуют.

«Людские ресурсы, которыми располагает страна, вселяют надежду на построение динамично развивающейся экономики. Образовательная система может готовить специалистов для разных видов экономической деятельности, рабочая сила дисциплинирована», — констатировал на этой неделе глава представительства Всемирного банка в Беларуси Ян Чул Ким, выступая в Минске на "Кастрычніцкім эканамічным форуме".

ДЛЯ РЕФОРМ ВСЁ ГОТОВО. БУДУТ ЛИ ОНИ?

По мнению экспертов, повышение эффективности белорусской экономики лежит в плоскости реформирования госсектора, который формирует порядка 70% белорусского ВВП. Всемирный банк неоднократно указывал, что госпредприятия в ряде случаев являются источником низкой эффективности, и рекомендовал провести структурные изменения в этом направлении.

По мнению белорусских экономистов, в том случае, если бы финансовые ресурсы распределялись исключительно на рыночных условиях, это привело бы к реформированию сектора госпредприятий и позволило повысить эффективность работы белорусской экономики.

Однако особенность белорусской экономической модели состоит в том, что финансовые ресурсы длительное время распределяются администра-тивным образом, и это позволяет поддерживать на плаву даже низкоэффективные предприятия. Для помощи таким предприятиям используются так называемые директивные кредиты, которые выдаются госбанками.

Вместе с тем на фоне больших выплат по внешнему госдолгу сегодня возможности государства как никогда ограничены, и власти всерьез задумались об эффективности использования финансовых средств. Оценки госорганов показали, что отдача от государственных инвестиций не радует.

Поэтому к настоящему времени Министерство экономики разработало концепцию повышения эффективности государственной поддержки экономики. По информации БелаПАН, документ уже передан в правительство и будет вноситься на рассмотрение президента.

Тот факт, что нынешняя система господдержки не дает желаемой отдачи, экономические власти сегодня признают.

«Всем понятно, что существует в стране проблема эффективности распределения ресурсов и необходимо эту задачу решать», — отметил заместитель министра финансов Максим Ермолович, выступая на "Кастрычніцкім эканамічным форуме".

Он дал понять, что пересмотр условий поддержки предприятий неизбежно приведет к тому, что некоторые организации могут потерять традиционные источники финансирования, вынуждены будут закрыться, и придется как-то трудоустраивать оставшихся без работы людей.

«Мы долго работали над вопросами, как обеспечить краткосрочную быструю переквалификацию людей для нужд экономики, какие затраты в связи с этим необходимы, кто будет финансировать этот процесс... Соответствующие механизмы к настоящему времени выработаны. Поэтому мы подготовлены к такому развитию событий, и в зависимости от того, какая будет скорость реформ, также произойдут и трансформации в области социальной поддержки населения», — отметил заместитель министра финансов.

В общем, экономические власти считают необходимыми структурные реформы и подготовились к этому. Однако оговорка о том, что конкретные меры будут зависеть от того, «какая будет скорость реформ», явно свидетельствует: правительство ждет политического решения по данному вопросу.

Миссия Международного валютного фонда, находившаяся в октябре в Минске, призывала белорусские власти к решительным реформам и выражала готовность поддержать структурную перестройку экономики новым кредитом.

Вместе с тем эксперты сомневаются в том, что руководство Беларуси готово сегодня к проведению серьезных изменений в экономике. «Мы делаем вывод, что отсутствует политическая воля и существует желание сохранить существующую модель», — констатировал Ян Чул Ким.

Дмитрий ЗАЯЦ,
naviny.by

Доброе утро, Слоним!

Холод на улице заставляет нас поджимать свои кулачки и прятать в шапки макушки. Но это не страшно, когда есть возможность вскоре согреться, страшно, когда превращается в лед наше сердце.

Каменное сердце в своей холодности черство судит, зачастую оценивая людей «в ничто». Чей-то один неприглядный элемент по жизни всегда будет в памяти в не имеющем любви сердце, которое навеки зачисляет «отступившего» в немилость. И кому тут хуже: тому, кто берет на себя роль судьи, или тому, кого осуждают?.. Второй может осознать свою ошибку, измениться и даже помочь другим избежать падения, в то время как первый всегда будет видеть только негативную сторону. Такое отношение напоминает два взгляда на жизнь, которые приведены в роли сознания мухи и пчелы.

Если спросить муху, есть ли здесь в окрестностях цветы, то она ответит: «Не знаю, а вот навоза, нечистот вон в той канаве полным-полно». И муха начнёт по порядку перечислять все помойки, на которых она побывала.

А если спросить пчелу: «Не видела ли ты здесь в окрестностях какие-нибудь нечистоты?», то она ответит: «Нечистоты? Нет, не видела. Здесь так много благоухающих цветов!» Муха на самом цветущем лугу найдёт нечистое место и сядет на него, а пчела в самом вонючем болоте отыщет цветок лотоса и соберёт с него нектар. Так и люди, одни — злые и аморальные — покажут свое высокомерие и осудят, а другие — добрые и благочестивые — покроют любовью проступок и окажут помощь…

Алёна АЛЬКО

НАВІНЫ МАСТОЎШЧЫНЫ

ДА МАСТАЎЛЯН ПРЫЙШОЎ "ЕЎРААПТ"

27 лістапада ў Мастах адчыніўся супермаркет "Еўраапт". Гэта самае вялікае пасля "Алмі" гандлёвае прадпрыемства з сучасным абсталяваннем.

Тут значны штат супрацоўнікаў — больш за паўтары сотні. У першы дзень працы сюды па тавар завітала некалькі тысяч чалавек. Ля 12 касаў паўсталі чэргі да 30 чалавек. Завабіла пакупнікоў не толькі навізна разрэкламаванага прадпрыемства, асартымент тавару, але і нізкія цэны, праўда, не на ўсе тавары.

Столькі ж наведвальнікаў у супермаркеце было і на наступны дзень. Многія не хавалі мэты свайго наведвання — ішлі як на экскурсію, пабачыць што і пачым.

Адкрыццё не абышлося і без непрыемнасцей. Некаторыя пакупнікі, скарыстаўшы вялікі натоўп, паспрабавалі вынесці ў сумачках дробны тавар, аднак сігналізацыя не дазволіла ім зрабіць гэта.

Многія мастаўляне прадракаюць "Еўраапту" шлях "Алмі", дзе зараз ідзе скарачэнне персаналу, а кошты сталі, як і ў мясцовай кааперацыі. Ужо ў нядзелю да абеду ў краме прадаўцоў было болей, чым пакупнікоў. У той жа дзень было заўважана, што кошты некаторых тавараў падняліся на тысячу-другую.

ААН ДАПАМАГЛА МАСТАЎЛЯНАМ АТРЫМАЦЬ ПРЫБЫТАК СА СМЕЦЦЯ

Пачынаючы з 2011 года, у Мастах стаў рэалізоўвацца пілотны праект ПРА ААН па раздзельным збіранні бытавых адыходаў з іх наступнай перапрацоўкай.

У рамках праекта мясцовая ЖКГ атрымала і ўстанавіла паўтары тысячы кантэйнераў і бакаў для раздзельнага збору смецця, біякампосцеры, а таксама розную тэхніку для яго вывазу. Самым складаным у гэтай справе было тое, лічыць начальнік ЖКГ Аляксандр Шалойка, каб жыхары горада зразумелі яе сутнасць.

Цяпер можна казаць пра нейкія вынікі. Бытавых адыходаў на палігон вывозіцца ўдвая менш: з 40 тысяч кубаметраў у год зменшылася да 20. Пасля ўстаноўкі біякампосцераў на 15% зменшыўся вываз смецця з прыватнага сектару. За 9 месяцаў гэтага года мастаўляне адправілі на перапрацоўку 118 тон шкла, 158 тон макулатуры і болей за 50 тон пластыку. Прыбытак ад таго атрымала казна раёна.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ВЫЕЗДНАЯ ПОДПИСКА НА I ПОЛУГОДИЕ 2015 ГОДА

5.12.2014 ПЯТНИЦА

10.00-11.00 ДЯТЛОВО
11.30-13.00 КОЗЛОВЩИНА
13.20-13.40 ПАВЛОВО
13.45-14.00 НОВОСЕЛКИ
14.10-14.20 ТАЛЬКОВЩИНА

12.12.2014 ПЯТНИЦА

9.30-09.50 ОЗГИНОВИЧИ
10.10-10.40 МЕЛЬКАНОВИЧИ
11.00-11.10 ОСТРОВО
11.20-11.30 МИЖЕВИЧИ
11.40-11.50 ПАСИНИЧИ
12.00-12.50 СЕЛЯВИЧИ
13.00-13.10 Б.КРАКОТКА
13.30-14.00 ОЗЕРНИЦА
14.20-14.40 ЕЛКА

19.12.2014 ПЯТНИЦА

9.30-09.50 ШИЛОВИЧИ
10.00-10.20 ЖИРОВИЧИ
10.40-11.10 ПАРТИЗАНОВКА
11.20-11.40 НОВОДЕВЯТКОВИЧИ
12.00-12.20 СУРИНКА
12.30-12.50 ГЛОВСЕВИЧИ
13.00-13.20 ДЕРЕВЯНЧИЦЫ

26.12.2014 ПЯТНИЦА

10.00-10.20 ЗЕЛЬВА
10.30-10.50 ДЕРЕЧИН
11.00-11.20 ГОЛЫНКА
11.40-12.10 КОСТРОВИЧИ
12.20.13.00 СЕНЬКОВЩИНА
13.10-13.30 ВАСИЛЕВИЧИ

Заглянем у сямейны альбом

Паважаныя чытачы! Калі ў вас захаваліся цікавыя старыя сямейныя фотаздымкі, дасылайце іх да нас у рэдакцыю з апісаннем гісторыі здымка, і мы з задавальненнем надрукуем іх у рубрыцы "Заглянем у сямейны альбом".

Пішыце нам на паштовы адрас: 231800, вул. Чырвонаармейская, 41, Слонім, Гродзенская вобласць, РБ, альбо дасылайце здымкі і тэксты па электроннай пошце gs@gs.by, альбо дзяліцеся інфармацыяй па тэл. 5-09-31, 6-36-58.

Арыгінал фотаздымка абавязуемся захаваць і вярнуць уладальніку.

Рэдакцыя

ПАСЛЯВАЕННЫЯ ШКОЛЬНІКІ

На гэтым фотаздымку мы бачым вучняў пачатковых класаў Востраўскай сямігодкі. Здымак зроблены ў другой палове 40-х гадоў.

У першым радзе другі злева стаіць Кананові Мікалай Георгіевіч 1940 года нараджэння. Мікалай Георгіевіч памёр у 1994 годзе. Магчыма, хтосьці з былых вучняў пазнае на гэтым фотаздымку сябе.

Мікола КАНАНОВІЧ

Фота з сямейнага архіва

АФИША

КИНОТЕАТР «МИР»

3 декабря

Зал — «Аномалия», 2014 год, Великобритания, фантастика, триллер, сеансы в 18.00 и 20.00

Видеосалон — «Телепорт», США, фантастика, сеансы в 16.00, 18.00 и 20.00

4 декабря

Зал — «Аномалия», 2014 год, Великобритания, фантастика, триллер, сеансы в 18.00 и 20.00

Видеосалон — «Телепорт», США, фантастика, сеансы в 16.00, 18.00 и 20.00

5 декабря

Зал — «Поворот не туда – 6», США, ужасы, 2014 год, сеансы в 18.00 и 20.00

Видеосалон — «Телепорт», США, фантастика, сеансы в 16.00, 18.00 и 20.00

6 декабря

Зал — Детский сеанс «Двенадцать месяцев», Россия, мультфильм, начало в 14.00; «Поворот не туда – 6», США, ужасы, 2014 год, сеанс в 16.00. Детская дискотека, начало в 18.00

Видеосалон — «Телепорт», США, фантастика, сеансы в 16.00, 18.00 и 20.00

7 декабря

Зал — Детский сеанс «Двенадцать месяцев», Россия, мультфильм, начало в 14.00; «Поворот не туда – 6», США, ужасы, 2014 год, сеансы в 16.00, 18.00 и 20.00

Видеосалон — «Телепорт», США, фантастика, сеансы в 16.00, 18.00 и 20.00

9 декабря

Зал — «Страховщик», Болгария — Испания, фантастика, триллер, сеансы в 18.00 и 20.00

Видеосалон — «Аномалия», Великобритания, фантастика, триллер, 2014 год, сеансы в 16.00, 18.00 и 20.00

ТЕАТР

Все спектакли (для детей и взрослых), которые были запланированы на 7 декабря, переносятся на 14 декабря. Приобретенные билеты будут действительны.

Казка на філалагічную тэму

Аснова

Сядзіць на лаўцы заяц Шарачок і старанна вымаўляе, вучыць правіла:

— Аснова — гэта частка слова без канчатка…

Падышоў да яго заяц Белячок, прысеў на самым краёчку.

Шарачок адразу перастаў вучыць правіла, закрыў кнігу.

— Я табе, відаць, перашкодзіў, — нясмела пачаў Белячок. Надакучыла яму цэлы дзень сядзець у хаце. З сябрам захацелася сустрэцца.

Шарачок хітравата ўсміхнуўся і неспадзявана прамовіў:

— **Дзец набірал у лес чырвон суніц.**

Белячку здалося, што добра не расслухаў.

— Што ты сказаў? Паўтары, калі ласка, — папрасіў ён сябра.

— **Дзец набірал у лес чырвон суніц,** — паўтарыў Белячок і зноў хітравата ўсміхнуўся.

Белячка быццам хвала падняла ўгору. Ён ускочыў з лаўкі.

— Хто ўлез? Куды ўлез?

— Трэба казаць «не ўлез», а «ў лес», — прагаварыў Шарачок.

Ды не зразумеў яго Белячок, вырашыў, што пацяшаецца сябар. Хацеў лапай махнуць і ўхату пайсці, але Шарачок адкрыў кнігу і прачытаў:

— Аснова — частка слова без канчатка, у якой заключана канкрэтнае лексічнае значэнне.

МАЛЮНАК ЯЎГЕНА ІВАНОВА

«Канкрэтнае — значыць пэўнае, дакладнае, тое, якое ёсць. Напрыклад: канкрэтны прадмет. Гэта той прадмет, які перада мною ці пра які я мару альбо гавару», — падумаў Белячок.

— Ты так і не зразумеў мяне? — быццам здалёку, данёсся да Белячка голас суседа.

— Здаецца, зразумеў, — сказаў Белячок. — У словах сказа Дзец назбірал у лес чырвон суніц няма канчаткаў. Іх лексічнае значэнне заключана ў аснове.

— Правільна разважаеш, Белячок. Лексічнае значэнне ўжытых у сказе слоў можна пазнаць нават без канчаткаў, бо гэта аснова паведаміць.

— Цікава! — у задуменні прамовіў Белячок.

— Давай пабудуем сказы са словамі без канчаткаў, — прапанаваў Шарачок.

— Давай! — пагадзіўся Белячок і сеў на лаўку.

— **На балоц касц кострав,** — назваў свой сказ Шарачок.

А Белячок прыдумаў такі:

— **На наш фабрыц выпуск салодк цукерк.**

Ціха на двары. Толькі птушкі пераклікаюцца, шчабечуць.

Сядзяць на лаўцы Шарачок і Белячок, будуюць сказы са словамі без канчаткаў і ўсміхаюцца. Весела ім.

Аляксей ЯКІМОВІЧ

Сканворд



ОТ ВЛАДИМИРА ВАШУТЫ

Слово-пароль



Ответы на сканворд:
по горизонтали: Жора. Роша. Багира. Трифон. Рим. Акка. Стадо. Ласт. Яд. Ядро.
по вертикали: Тис. Бита. Жираф. Дядя. Огород. Рощин. Ар. Алеко. Арка. Икс. Мат.

ОТГАДАЙ ЗАГАДКУ — И ВЫИГРАЙ СУВЕНИР!

“В классе учатся 4 пары близняшек. А всех — родителей и учеников — насчитывается 85 человек (у каждого есть папа и мама). Сколько учеников учится в этом классе?” Такая загадка предлагалась в прошлом номере “Праменьчыка”. На нее правильно ответили **Александр Скурат, Оксана Тарановская, А. Николайчик, Олег Анисимов, Людмила Фандеева, Светлана Тишко, Татьяна Жуковская, Виктор Кондратюк, Мария Савицкая, Игорь Шиманский, Николай Ракевич, Дмитрий Навроцкий, Анна Коневега, Елена Шундрик, Николай Лупеченко, Максим Гордейко, Алла Сахаруша, Алиса Клыбик, Светлана Клыбик.** Правильный ответ — 31 ученик.

А вот новая загадка — по картинке. Решите числовое равенство. Одинаковым буквам должны соответствовать одинаковые цифры.

Ответ на загадку присылайте до 8 декабря в SMS-сообщении на номер 8 029 133-04-21. Не забудьте написать свое имя, фамилию и домашний адрес, так как в случае верного ответа сувенир — магнитик с логотипом «ГС» — будет выслан вам по почте.

Вернісаж

Свет вачыма дзяцей

“У падводным царстве”

“Зімовыя забавы”

Малюнкі Данііла Чарамных, сябра гуртка “Юны мастак-краязнаўца”, якім кіруе мастак Яўген Іваноў.

“Угэтую суботу Даніку споўніцца 10 гадоў. Гэта ўдумлівы, вельмі развіты хлопчык, які многа чытае і займае першыя месцы ў інтэлектуальных гульнях”, — сказаў пра свайго выхаванца Яўген Іваноў.

Старонку падрыхтавала Наталля ІВАНОВА

Намеснік галоўнага рэдактара
Мікола КАНАНОВІЧ
Журналісты
Уладзімір ШУМЕЛЬ
Яўген ВАЛАДАШЧУК
Кацярына ЯНУШЭВІЧ
Таццяна ДЗЕНІСЮК
Алена КАСЦЮК
Стыль-рэдактар
Жанна ПЛЕШКО

Галоўны бухгалтар
Юлія ЛІБІК
Бухгалтар
Вольга БУРСЕВІЧ
Аддзел падпіскі і продажу
Аляксей НАВІЦКІ
8-(029) 322-06-42
Вёрстка і дызайн
Уладзімір КАЧАРГА
Алена ДЗЯТЛАВА

Тэлефоны рэдакцыі:
т/факс: **8 (01562) 5-09-31,**
Тэл. 6-36-58, 6-36-68, 6-36-54, 6-36-44.
МТС: **8-029-584-87-32**
Velcom: **8-029-133-04-21**
Skype — gazslon
(9.00-18.00)
Для карэспандэнцыі:
231799, г. Слонім,
вул. Чырвонаармейская, д. 41
e-mail: gs@gs.by,
gazslon@gmail.com

Рэкламная служба
Начальнік рэкламнай службы
Ганна ВАЛАДАШЧУК
anna@gs.by
8-(029) 612-26-43
Супрацоўнікі
Наталля СТРУПАВЕЦ
Людміла КАМЯНЕЦКАЯ
Наталля СЕМЯНОВІЧ
8-(044) 715-90-03
(9.00–16.00)
т/факс:
8-(01562)-5-09-27

Прыём аб'яў і падпіска:
г. Слонім, Чырвонаармейская, 73 Б
(будынак АРЗ)
Працуем аўторак — пятніца 9[00]-17[00]
субота — нядзеля 9[00]-15[00]
выхадны — панядзелак
8-(044) 762-48-39

погода на неделю

	утро	день	вечер
СРЕДА, 3 декабря	-10°	-6°	-5°
ЧЕТВЕРГ, 4 декабря	-4°	-3°	-5°
ПЯТНИЦА, 5 декабря	-5°	-5°	-5°
СУББОТА, 6 декабря	-2°	-2°	0°
ВОСКРЕСЕНЬЕ, 7 декабря	-2°	-2°	0°
ПОНЕДЕЛЬНИК, 8 декабря	0°	0°	-1°
ВТОРНИК, 9 декабря	0°	0°	-3°
СРЕДА, 10 декабря	0°	2°	-3°

http://www.meteoprog.by

ПРАЗДНИК

В РЕСТОРАНАХ И КАФЕ СЛОНИМА В НОВОГОДНЮЮ НОЧЬ МЕСТА ЕЩЁ ЕСТЬ, А УСАДЬБЫ УЖЕ ЗАРЕЗЕРВИРОВАНЫ

Корреспондент «Газеты Слонимской» узнавала, сколько будет стоить новогодний праздник для тех, кто решил провести его вне дома.

Как выяснилось, ночь с 31 декабря на 1 января на одного человека обойдется в увеселительных заведениях города от 350 до 700 тысяч рублей. В заказ в основном входят горячие и холодные блюда, спиртное, сок, минералка.

Корреспондент также поинтересовалась содержанием новогодней программы, но в большинстве заведений она еще на этапе разработки.

На 1 декабря места ещё были везде, кроме ресторана «Золотой Феникс».

— На данный момент свободных мест в новогоднюю ночь у нас нет, звоните чуть позже, возможно, кто-то откажется, бывает и такое, — посоветовали в «Золотом Фениксе».

Что касаемо цен, то самую приятную назвали в пиццерии «Венеция». Там нужно сделать заказ на 350 тысяч рублей. Однако огорчили в «Венеции» тем, что Деда Мороза и Снегурочки у них не будет.

В кафе «101 этаж» нужно заплатить за место 50 тысяч, а также сделать заказ не менее чем на 350 тысяч.

В ресторане «Верас» нужно сделать заказ на 500 тысяч, в ресторане «Полонез» — на 400 тысяч рублей и ещё заплатить за место 40 тысяч.

Самый дорогой вариант — новогодний банкет в ресторане «Золотой Феникс». Он обойдется в 700 тысяч рублей на человека. В этом заведении запланировано новогоднее представление с участием Деда Мороза и Снегурочки, а также танцы, конкурсы и другое.

В кафе «Щара» и ресторане «Слоним» нужно сделать заказ не менее чем на 400 тысяч рублей. В баре «Оазис» новогодняя ночь обойдётся минимум в 450 тысяч рублей на человека.

Встретить Новый год на съёмной квартире большой компанией выйдет в среднем в один миллион белорусских рублей.

Снять агроусадьбу под Слонимом уже не получится. Во всех трёх агроусадьбах и в охотничьем домике на 1 декабря всё уже было зарезервировано.

В новогоднюю ночь с 00:30 до 5:00 будет работать дискотека «Оскар». Вход туда стоит 100 тысяч, только следует заранее забронировать столик.

Татьяна ПЛАХЕТКО
plaha_t@qip.ru

P.S. В следующем номере корреспондент «ГС» составит основное новогоднее меню, подсчитает, сколько в среднем обойдется новогодний стол для небольшой компании дома.

ЖИВОТНЫЕ ИЩУТ ДОМ

ИМ НУЖНА ЗАБОТА

Соня — добрая кошечка, 3-4 месяца, ищет ответственных и заботливых хозяев. Воспитанная, к когтеточке и лотку приучена. Привоз в новую семью обеспечим.

Ольга, 8-033-620-40-04

Щенкам нужны добрые руки и ответственные хозяева. Вырастут небольшими.

Людмила, 8-029-866-69-11

Рыжик — ласковый, самостоятельный добрый кот. К лотку приучен. В еде неприхотлив.

Ольга, 8-029-786-85-04

Ведущая рубрики Татьяна ПЛАХЕТКО
plaha_t@qip.ru

Дзякуй за тое, што выбралі "Газету Слонімскую"!

Галоўны рэдактар Віктар Уладзіміравіч Валадашчук, victor@gs.by
ЗАСНАВАЛЬНІК Віктар Уладзіміравіч ВАЛАДАШЧУК
Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах
Рэгістрацыйнае пасведчанне №64 ад 05.03.2009 года, выдадзена Міністэрствам інфармацыі РБ. Свидетельство о госрегистрации УП "Газета Слонимская" ЮКЛ № 001845, выданное Гродненским областным исполнительным комитетом от 03.04.2003 г.
Юрыдычны адрас: 231800, г.Слонім, вул. Чырвонаармейская, 41
Падпісныя індэксы: 64042 (індывідуальная) 63818 (ведамасная) 63646 (ільготная)
Свабодны кошт
Час падпісання да друку па графіку 2 снежня 2014 года 16:00.
Аб'ём – сем умоўных друкаваных аркушаў.
Надрукавана ў друкарні ГАУПП "Гродзенская друкарня" г.Гродна, вул. Паліграфістаў, 4, індэкс 230025.
Заказ № 7321